Рышард Капусьцінскі



...Захад, які Расія зачароўвае, але і напаўняе страхам,
заўсёды гатовы прыйсьці да яе з дапамогай,
хоць бы таму, што зацікаўлены ва ўласным спакоі.
Захад адмовіць іншым, але Расіі дапаможа заўсёды...

# Імперыя

***Разьдзелы з кнігі***

*Заканчэньне. Пачатак у №5-6 (30-31) за 2007 год і №1-2 (32-33).*

*Пераклад з польскай Яўгена САЛЕЙЧУКА.*

## Працяг ідзе (1992-1993).

Дваццатае стагоддзе ў сучаснай гісторыі Расіі распачалося рэвалюцыяй 1905 году і завяршылася рэвалюцыяй, якая скончылася распадам СССР у 1991 годзе.

Гісторыя ў гэтай краіне – гэта жывы вулкан, увесь час бушуе і не відаць, каб хацела супакоіцца, каб хацела супакоіцца і перадыхнуць.

Расійскі пісьменьнік Юры Бораў параўнаў гісторыю СССР з цягнікам:

“Цягнік едзе ў сьветлую будучыню. Вядзе яго Ленін. Раптам – стоп, далей няма дарогі. Ленін заклікаў да дадатковай працы ў суботу, паклалі рэйкі і цягнік паехаў далей. Цяпер павёў яго Сталін. Ізноў скончылася дарога. Сталін загадаў расстраляць палову праваднікоў і пасажыраў, а рэшту прымусіў класьці новую дарогу. Цягнік рушыў далей. Сталіна замяніў

Хрушчоў, а калі скончыліся рэйкі, загадаў разьбіраць тыя, па якіх цягнік ужо праехаў, і укладваць іх перад паравозам. Хрушчова замяніў Брэжнеў. Калі ізноў скончылася дарога, Брэжнеў загадвае завесіць вокны і разгойдваць вагоны так, каб пасажыры думалі, што цягнік едзе далей". (Ю. Бораў – "Сталініяда").

Такім чынам мы даходзім да Эпохі Трох Пахаваньняў (Брэжнева, Андропава, Чарненкі), у якой пасажыры цягніка нават ня маюць ілюзіяў, што едуць. Але вось у красавіку 1985 году цягнік ізноў пачаў рухацца. Аднак гэта яго апошняе падарожжа. Працягнецца яно шэсьць з паловай гадоў. На гэты раз машыністам – Гарбачоў, а на лакаматыве намаляваны лозунг: "Гласность – Перестройка".

Пра Расію гаварыць тым лягчэй, чым больш гэтай назьве надаецца абстракты сэнс. "Расія шукае шляхоў", "Расія кажа – не", "Расія ідзе направа" і г.д. На такім высокім узроўні абагульненасьці многія праблемы губляюць значнасьць, перастаюць улічвацца, зьнікаюць. Ідэалагічна-дзяржаўны макраўзровень адсоўвае на перыферыю і скасоўвае штодзённы і дакучлівы мікраўзровень. Ці застанецца Расія супердзяржавай? У параўнаньні з такім вялікім пытаньнем хіба мае якое-небудзь значэньне справа, што турбуе Анну Андрэеўну з Ноўгараду, а менавіта – ці дадуць ёй яшчэ пажыць нармальна? Лексіка ўсюдыіснай палітыкі выключае са сродкаў масавай інфармацыі і, што горш – з нашай памяці таксама, мову, якой можна выказаць чыесьці індывідуальныя клопаты, асабістую чыюсьці прыватную трагедыю, чыйсьці асабісты боль. Нехта ня мае даху над галавой? Гэтым мы не займаемся, гэта справа для Арміі Выратаваньня ці Чырвонага Крыжа.

Аднак жа пазьбегнуць гэтага абстрактнага падыходу не атрымаецца. Вялізны маштаб падзеяў, якія адбываюцца, можна ўявіць, толькі ўжываючы мову і паняцьці агульныя, сінтэзуючыя, абстрактныя, усьведамляючы, што раз за разам мы будзем трапляць у пастку спрашчэньняў і легкадумных сьцьверджаньняў.

Ёсьць пісьменьнікі, якія разумеюць слова "Расія" ў містычным сэнсе, як таямнічы, бяздонны сакрум. Паэт Фёдар Цютчаў пісаў, што "Умом Россию не понять. В Россию можно только верить". Дастаеўскі лічыў, што Расія для Еўропы – нешта загадкавае і незразумелае: "Для Еўропы Расія – гэта адна з загадак Сфінкса. Захад хутчэй вынайдзе perpetuum mobile ці эліксір жыцьця, чым зразумее сутнасьць расейскасьці, дух Расіі, яе характар і арыентацыю".

Вера ў Расію час ад часу прымае рэлігійную афарбоўку. У Маскве я бачыў маніфестацыю, падчас якой вялікі натоўп прамаўляў літаньне да Расіі з такой набожнасьцю, з якой удзельнікі пілігрымкі на Яснай Гуры прамаўляюць літаньне да Маткі Боскай.

Іншыя расейскія пісьменьнікі падкрэсьліваюць, што Расія не падобная да ніводнай іншай краіны, што яе трэба трактаваць як нешта выключнае, як своеасаблівы і ўнікальны феномен. "Калі гавораць пра Расію, – піша Пётр Чаадаеў, – часта ўяўляюць яе такой жа, як і іншыя, дзяржавай; па сутнасьці ўсё зусім інакш. Расія – гэта цэлы своеасаблівы сьвет". Тое самае сьцьвярджае Канстанцін Аксакаў. "Расія, – піша ён – гэта краіна цалкам самабытная, ані каліва не падобная да еўрапейскіх дзяржаваў і краінаў".

Напачатку я ня думаў пра вялікае падарожжа. Хацеў толькі паехаць

у Закаўказьзе, туды, дзе быў дваццаць год таму, напрыканцы шасьцідзясятых. Гэты невялікі абшар, заваяваны Расіяй, а потым сілай далучаны да СССР, сапраўды цікавіў мяне, бо найбольш цікавіць мяне ментальная і палітычная дэкаланізацыя сьвету, а там, у Закаўказьзі, разьвіваўся менавіта такі працэс. XX стагоддзе, гэта ня толькі стагоддзе таталітарызмаў і сусьветных войнаў, але таксама найвялікшая ў гісторыі эпоха дэкаланізацыі: на мапе сьвету зьяўляецца больш за сто новых дзяржаваў, цэлыя кантыненты здабываюць – прынамсі фармальную – незалежнасьць. Нараджаецца Трэці Сьвет, і пачынаецца вялікі дэмаграфічны выбух – насельніцтва слаба разьвітых краінаў пачынае расьці ў тры разы хутчэй, чым насельніцтва заможных краінаў. З гэтага вынікае тузін праблемаў, якія будуць клопатам XXI стагоддзя.

Той самы працэс экспансіі Трэцяга Сьвету, які стаў прычынай распаду каланіяльных імперыяў Англіі, Францыі і Партугаліі, ужо адчуваўся і ўнутры апошняй каланіяльнай імперыі на зямлі – у СССР. У канцы васьмідзясятых гадоў нерасейскае насельніцтва гэтай дзяржавы складала каля паловы яе жыхароў, у той жа час эліта ўлады на 95 адсоткаў складалася з расейцаў ці зрусіфікаваных прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяў. Пытаньнем часу было, калі ўсьведамленьне гэтага факту стане для тых меншасьцяў сігналам да эмансіпаваных выступаў.

Такім чынам, спачатку я планаваў паехаць, як раней, з Масквы ў Грузію, а потым у Арменію і Азербайджан. Але мне сказалі, што гэта немагчыма. Граніца паміж Арменіяй і Азербайджанам закрытая, ідзе вайна, на якую ніхто ня можа паўплываць.

Для мяне гэта быў шок.

Каб нехта тут заявіў, што Масква ня мае ўплыву на тое, што адбываецца ў СССР? Менавіта гэта – прызнаньне імперскай улады ў сваім бясьсільлі, было для мяне сапраўднай рэвалюцыяй! Я ж памятаю, як двадцаць гадоў таму, калі я быў у Азербайджане, замест калгасу імя Кірава хацеў паглядзець калгас імя Сьвярдлова, але пачуў адказ, што гэта немагчыма: “Такую праграму дала нам Масква, мы нічога ня можам зьмяніць”. Пачаліся званкі, пытаньні, высьвятленьні. Нарэшце прыйшоў адказ: “Добра, хай будзе імя Сьвярдлова”. Гаворка ішла пра дробязь, пра глупства. Але сістэма заключалася ў той дробязнасьці, псіхапатычна падрабязным кантраляваньні ўсяго, утрапёным жаданьні панаваць над усім. Юрый Бораў кажа, якімі, паміж іншага, справамі займаўся Сталін. Ён выдаваў распараджэньні падобнага роду: “Перадаць швейную машыну, якая належыць швейнаму прадпрыемству нумар 1, фабрыцы нумар 7. І.Сталін”.

А тут вялікае здарэньне: дзьве рэспублікі закрываюць межы і вядуць вайну, а Масква нічога ня можа зрабіць!

Другі шок я пераЖЫў наступным днём, калі прыляцеў у Ерэван. Я пайшоў на шпацыр і раптам сустрэў на вуліцах узброеныя групы барадатых людзей. Бачу, што не Савецкая Армія. Мінакі кажуць, што гэта аддзелы самастойнай армянскай вызваленчай арміі. Для мяне было незразумелым убачыць у Імперыі войскі, якія не былі часткай Савецкай Арміі ці КДБ. Здаўна ведаючы гэтую краіну і сістэму, я чакаў, калі дывізіі расейскіх войскаў рушаць на сталіцу Арменіі, расправяцца з маладымі армянамі, а тысячы жыхароў гораду ў пакараньне перасяляць у Сібір. Але нічога такога не адбывалася.

Трэцяй нечаканасьцю, вечарам таго ж дня, была сцэна, якую я ўбачыў

на экране тэлевізару. Ішла трансьляцыя з паседжаньняў Вярхоўнага Савету. Адзін з дэпутатаў пачаў бурна сварыцца з Генеральным сакратаром ЦК – Гарбачовым. Я застыў. Сварыцца з Генеральным сакратаром? Калісьці гэта пагражала расстрэлам. Пазьней – паламанай да канца жыцьця кар’ерай. А цяпер – дэпутат сышоў з трыбуны, сабраўшы шмат воплескаў.

Падсумоўваючы гэта ўсё, я падумаў: канец Саветам! Для мяне Імперыя распалася ў той час, восеньню 1989, на трасе Масква-Ерэван. Усё, што здарылася пазьней, было ўжо толькі дакідваньне адламкаў да раней насыпаных руінаў.

Думаю, толькі тыя, для каго сталінізм-брэжневізм зьяўляецца часткай іх жыцьцёвага досьведу, могуць заўважыць і зразумець глыбіню, незвычайнасьць і значнасьць той перамены і таго пераўтварэньня, што адбыліся ў 1985-1991 гадах у СССР. Я сустракаў там на сваім шляху маладых калегаў-рэпарцёраў. Тое, што яны бачылі, было для іх цікавым, але нармальным і відавочным. Для мяне ўсё был нечуваным і ўзрушальным, я ня верыў уласным вачам.

Некалькі словаў пра 1985 год.

Крызіс камуністычнай сістэмы, у тым ліку – СССР, у той час становіцца ўсё больш глыбокім, больш выразным, больш вострым:

– перажывае сябе і згасае зьвязаны з Масквой нацыянальны вызваленчы рух у краінах Трэцяга Сьвету;

– распадаюцца і губляюць значнасьць камуністычныя партыі ў заходніх краінах;

– “Салідарнасьць” у Польшчы, нягледзячы на рэпрэсіі ваеннага становішча, стварае ў сістэме рэальнага сацыялізму моцны пралом, які непазьбежна пашыраецца;

– Масква прайграе гонку ўзбраеньняў з Захадам, усё больш выразна застаецца ззаду са сваёй састарэлай тэхналогіяй і нізкай прадуктыўнасьцю працы, губляе пазіцыю за пазіцыяй у гульні за сьвет.

Па меры таго, як супердзяржава губляе сілы і ідзе да скону, разам з ёй адыходзіць цэлая генерацыя правадыроў. На працягу некалькіх гадоў, якія папярэднічаюць гістарычнаму 1985 году, па чарзе паміраюць Кулакоў, Рашыдаў, Суслаў, Брэжнеў, Касыгін, Усьцінаў, Андропаў. Апошні з той групы, Чарненка, памірае 11 сакавіка 1985 году. Іншыя, як Грамыка і Грышын, усё мацней хварэюць, ці, як Раманаў, патанаюць у алкагалізме, ці, як Аліеў – у страшэннай карупцыі.

Таксама ў гэтай краіне існуе грамадская думка, хоць да перабудовы яна выказваецца інакш, як у дэмакратычных краінах. Тады людзі выказвалі сваю думку маўчаньнем, а не прамаўленьнем. Але сам характар іх маўчаньня быў значны і казаў шмат. Спосаб, якім на кагосьці ці на штосьці глядзелі, быў вельмі красамоўны. Важна таксама, куды яны прыходзілі, і дзе іх не было. Шмат казала павольнасьць, з якой зьбіраліся на прымусовы сход, і хуткасьць, з якой разыходзіліся. Нягледзячы на пагарду і нахабства ўладаў адносна грамадства, яны ўсё ж зьвярталі ўвагу на тып маўчаньня, які ў тым самым грамадстве панаваў. У Пецярбургу я спаткаў студэнта, які на гарадскім пленуме камсамолу (у эпоху Брэжнева) быў “адказным за настрой у зале”. Вось жа, грамадскую думку ў 1985 годзе лепш за ўсё

адлюстроўвае назва фільма, зробленага ў канцы васьмідзясятых гадоў расейскім рэжысёрам Станіславам Гаварухіным: “Так жыць нельга”.

А ўсе тыя крызісы, у якіх загразла Імперыя ў той час і на міжнароднай арэне, і ва ўнутраным жыцьці, адбываліся ва ўмовах усеагульнай, штодзённай людской беднасьці, у агульнай матэрыяльнай нястачы і безнадзейнасьці. Варта памятаць, што называнае “прывілеем кіроўнага класу” – было прывілеем адносным, на тле нэндзы. Жыхар багатай краіны часта пасьмяяўся бы з такіх прывілеяў. Так недзе на Украіне пачаўся скандал, калі ў нейкага працаўніка партыйнай інстанцыі падчас руху яго аўтамабіля адкрыўся багажнік, і мінакі заўважылі, што ў тым багажніку ляжыць каўбаса. Я сам быў сьведкам іншага скандалу ва Уфе – справа была ў тым, што на рынку прадавалі гнілыя яблыкі, а працаўнікам апарату – што праўда, чарвівыя, але ж не гнілыя! Колькі ж разоў на парогах таго жытла, дзе мне прыходзілася спыняцца, гаспадары віталі мяне словамі: “Ришард, извини нашу советскую нишчету!”. Часам вечарамі тэмаю размовы быў узровень і якасьць жыцьця ў багатых краінах. У канцы маіх расповедаў расейцы ўсьміхаліся і казалі з пэўнай пакорай у голасе: “Это не для нас…”.

Вось у такой сітуацыі, у сакавіку 1985 году, генеральным сакратаром ЦК КПСС робіцца выбраны па рэкамендацыі Андрэя Грамыкі Міхаіл Гарбачоў. Праз месяц, на красавіцкім пленуме партыі ён зачытвае даклад, які адкрывае эпоху перабудовы і галоснасьці. У нейкім сэнсе перабудова і галоснасьць – гэта штучныя лёгкія, падключаныя да ўсё менш працаздольнага, згнілага арганізму СССР. Дзякуючы ім, СССР пражыве яшчэ шэсьць з паловай гадоў. Я згадваю пра гэта, бо ворагі Гарбачова сьцьвярджаюць, што ён стаў на чале квітнеючага СССР і давёў яго да распаду. Якраз наадварот – СССР распаўся даўно, а Гарбачоў падоўжыў яго існаваньне, наколькі было магчыма. Я згадваю яшчэ і таму, што (гэта адзін з сусьветных парадоксаў) дакладна перад распадам СССР у заходняй саветалогіі, асабліва сярод амерыканскай часткі палітолагаў, распаўсюдзілася тэорыя пра СССР як мадэль найбольш стабільнай і трывалай сістэмы ў сьвеце. Галоўным прадстаўніком гэтай школы мысьленьня зьяўляецца прафесар Дукскага універсітэту, Джэры Ф. Гоў. Як піша Тэадор Драпэр (“The New York Review of Books”, 11.VI.1992), сярод амерыканскіх палітолагаў не было ніводнага, хто прадбачыў бы распад СССР.

Таму, калі ў канцы 1991 году СССР перастае існаваць, у сьвеце чуюцца галасы разгубленасьці і зьдзіўленьня. Як гэта – такі стабільны і распаўся? За адзін дзень? Але гэтае “за адзін дзень” тычылася ўжо толькі фінальнага акту. Насамрэч распад пачаўся значна раней.

Для мяне перабудова была спалучэньнем двух вялікіх працэсаў, якім паддалося грамадства Імперыі:

– масавы курс лячэньня ад страху;

– сумеснае падарожжа ў сьвет інфармацыі.

Той, хто ня быў выхаваны ў сьвеце без інфармацыі і ў атмасферы ўсеагульнага, жывёльнага страху, з цяжкасьцю зразумее, пра што тут гаворка.

Фундаментам савецкай Імперыі быў тэрор і яго неадлучнае, дрыготкае дзіця – страх. Паколькі Крэмль адмаўляецца ад палітыкі масавага тэрору пасьля сьмерці Сталіна і Берыі, можна сказаць, што іх адыход – гэта

пачатак канца Імперыі. Хрушчоўская адліга, а потым гады застою трохі зьмякчаюць кашмар жаху, характэрны для эпохі Сталіна, аднак жа не ліквідуюць яго ў радыкальнай ступені. Працягваюцца перасьледы дысідэнтаў, выкідаюць з працы тых, хто думае ня так, як трэба, шалее цэнзура і г.д. Толькі перабудова і галоснасьць уносяць прынцыповыя зьмены. Людзі ўпершыню пачынаюць выказваць уласную грамадскую пазіцыю, мець свой погляд – крытыкаваць і патрабаваць. Натуральна, людзі захапляюцца захлынаюцца свабодай слова, аднак праз пэўны час пачынае нечувана стамляць, калі ўсе і паўсюль без перапынку гавораць, гавораць і гавораць. Або – пішуць, пішуць і пішуць. Паводка словаў, мільярды словаў у залах сходаў, на ўсіх хвалях эфіру, на тонах, сотнях тон аркушаў паперы. Гэтай перанасычанасьці прамаўленьняў, гэтай узбуджанай плыні словаў спрыяе і сама расейская мова, сказы ў якой шырокія, прасторныя, бясконцыя, як расейская зямля. Тут няма ніякай картэзіянскай дысцыпліны, ніякага афарыстычнага аскетызму. Трэба брысьці і брысьці праз плынь чыйго-небудзь выступу ці праз шмат старонак тэксту, каб патрапіць на вартае ўвагі выказваньне. Колькі ж трэба папрацаваць, каб знайсьці тую перліну!

Справа ня толькі ў тым, што можна казаць, але і ў тым, што ёсьць аб чым гаварыць. Бо адначасова пачалося падарожжа ў сьвет інфармацыі. Прасьцей кажучы: адным з прынцыповых адрозьненьняў паміж першай і другой паловай нашага стагоддзя (асабліва гэта тычыцца апошніх гадоў) ёсьць тое, што людзі кожнай з гэтых эпохаў жылі (і жывуць) у цалкам іншым інфармацыйным сьвеце. З гэтага гледзішча чалавек першай паловы стагоддзя, асабліва ў СССР, быў бліжэй да пячорнага чалавека, чым да таго, які сёньня сядзіць за кампутарам і, націскаючы на клавішы, можа адразу ж атрымаць усю патрэбную інфармацыю. На гэтае адрозьненьне зьвяртае ўвагу адзін з расейскіх пісьменьнікаў-дысідэнтаў, Леў Копелеў, у сваёй кніжцы “Кумір маёй маладосьці”, дзе піша, што раней адносна інфармацыі нават дарослыя былі дзецьмі, а сёньня – нават дзеці зьяўляюцца дарослымі. Людзі насамрэч ў той час мала ведалі. Адным з сапраўдных прывілеяў быў менавіта доступ да інфармацыі. Архівы КДБ ахоўваліся лепш, чым арсеналы зброі масавага зьнішчэньня. Адзін з расейскіх журналістаў (ня помню яго прозьвішча) згадвае, што калі пасьля ўвядзеньня савецкіх войскаў у Чэхаславакію ён спытаў Брэжнева, што можна пісаць пра сітуацыю ў той краіне, той адказаў яму: “Пішыце што заўгодна, але толькі ў адзіным экземпляры і дасылайце толькі мне”.

А тут раптам зьяўляюцца згадкі і пра Катынь, і пра Курапаты, і пра Салаўкі.

Пасьля пяці гадоў вялікіх намаганьняў і напружаньня Гарбачоў усё больш стомлены, разгублены і зьнерваваны. Відаць, што ён губляе ініцыятыву і дынамізм, а яго палітыка, дагэтуль такая стваральная і ва ўмовах Расіі наватарская і нязвыклая, пачынае характарызавацца руцінай, недахопам рашучасьці і саступніцтвам. У сьнежні 1990 году міністр замежных справаў і правераны саюзьнік Гарбачова – Эдуард Шэварнадзэ публічна перасьцерагае, што кансерватыўныя сілы рыхтуюць дзяржаўны пераварот у краіне, і падае ў адстаўку. Але Гарбачоў не рэагуе на гэтую перасьцярогу. Яго атачэньне цяпер – гэта людзі, якіх ён сам прызначыў

на вышэйшыя пасады, і якія ў хуткім часе яму здрадзяць і выступяць супраць яго. Гэта ўсё партыйныя бюракраты, неасталінская рэакцыя.

Надыходзіць вырашальны 1991 год, які ўвойдзе ў аналы найноўшай гісторыі сьвету. Ён пачынаецца крывавымі здарэньнямі ў Вільні і ў Рызе. Войскі КДБ атакуюць танкамі бязбройную маніфестацыю ў Вільні – гіне некалькі чалавек, дзясяткі параненых. Летувісы акружаюць бетоннымі перашкодамі будынак свайго парламенту. Калі я ўваходжу туды, сярэдзіна нагадвае мне памяшканьне ўмацаванага замку ў перыяд аблогі. У вокнах мяшкі з пяском, паўсюль пільнуюць маладыя дабраахвотнікі са зброяй у руках – у любы момант чакаюць атакі звонку. Напружаны, але спакойны і ўпэўнены ў сабе прэзідэнт Ландсбергіс ходзіць сярод іх, падбадзёрвае. Гэтак сама, як у Вільні, бетонныя заслоны ахоўваюць будынкі нацыянальных парламентаў у Рызе і ў Таліне. Найбольш сур'ёзныя барыкады ў Таліне. Каб дабрацца да парламенту, трэба прайсьці праз калідоры, пабудаваныя так хітрамудра, бы лабірынт Мінаса.

"Хто адказвае за кроў, пралітую ў Вільне і ў Рызе?" – пытаюць дэмакраты ў Маскве і паказваюць на шэфа КДБ – Кручкова і міністра ўнутраных справаў – Пуга. Але Гарбачоў не выкідвае іх з ураду. Яму не хапае сілы? Ён ня ведае, што рабіць?

Летам ён выязджае з сям'ёй у адпачынак, у Крым.

Усё яго атачэньне, на чале з віцэ-прэзідэнтам Янаевым, ідзе ў атаку. 19 жніўня пачынаецца трохдзённы путч. Танкі акружаюць так званы Белы Дом – сядзібу ўраду і парламенту Расійскай Федэрацыі і месца працы яе прэзідэнта – Барыса Ельцына. Ельцын асуджае тэрарыстаў і арганізуе абарону Белага Дому.

Путч быў задушаны, а яго арганізатары адпраўленыя ў турму. Аказваецца, што танкісты, кінутыя ў бой за ўладу над ядзернай супердзяржавай, два дні не атрымлівалі ніякага харчаваньня. У многіх з іх няма ботаў, яны ходзяць у красоўках. Жанчыны, якія абараняюць Белы Дом, шкадуюць галодных танкістаў, разьязджаюцца па дамах і прывозяць ім нешта паесьці. Накормленыя танкісты запэўніваюць міласэрных жанчынаў, што ня будуць страляць – і трымаюць сваё абяцаньне. Праз некалькі дзён маскоўская прэса інфармуе, што калі пачынаўся путч, маці кіраўніка перавароту Янаева ляжала ў шпіталі Крамля. Пасьля паведамленьня пра пераварот, які даў уладу яе сыну, пацыенты шпіталю пазлазілі з ложкаў і пайшлі да бабулькі шчыра віншаваць яе. Калі пераварот не атрымаўся, а Янаева арыштавалі, тыя самыя пацыенты ізноў пазлазілі з ложкаў, але на гэты раз выправіліся да дырэктара, катэгарычна патрабуючы, каб бабульку выкінулі са шпіталю.

Гарбачоў вяртаецца з Крыму. У нядзелю, 25 жніўня, у Маскве адбываецца пахаваньне трох расейцаў – ахвяраў апошніх падзеяў. Мільён людзей прыходзіць да Крамля, адкуль пачынаецца шэсьце, каб ушанаваць іх. Я чую зводдаль чыйсьці голас, які даносіцца да мяне праз рэпрадуктар. Але людзі ў натоўпе размаўляюць, ніхто не зьвяртае ўвагі. "Хто прамаўляе?" – пытаю. Нехта адказвае: "Гарбачоў". І размаўляе далей. Ужо ніхто ня слухае Гарбачова, ён перастаў цікавіць людзей.

Гісторыя адбываецца на нашых вачах, у кожны момант, кожную гадзіну. Падчас гэтага пахаваньня я раблюся сьведкам нараджэньня новага класу. Калі мы стаім на прасьпекце Калініна ў чаканьні галавы працэсіі, да нас

падыходзіць высокі, малады чалавек у бедным цыратавым плашчыку і кажа:

– Абаронцы Белага Дому, выйсьці!

Маўчаньне, ніхто ня рухаецца. Аднак пасьля чарговага закліку выходзіць з натоўпу, мяркуючы па выглядзе, студэнт. За ім, праз хвіліну, нехта наступны. І так пачала зьбірацца ўсё большая грамада тых абаронцаў. Урэшце чалавек у цыратавым плашчыку ўбачыў, што тыя абаронцы пачынаюць ствараць новы натоўп, і перапыніў набор. Пачаў запісваць прозьвішчы ахвотнікаў і сказаў ім прыйсьці на сход у бліжэйшы аўторак. Яны створаць арганізацыю ці рух Абаронцаў Белага Дому. Атрымаюць значкі і пасьведчаньні. А праз некалькі там гадоў будуць міністрамі, генераламі, амбасадарамі.

Пасьля жніўеньскага путчу Гарбачоў сыходзіць з пасады Генеральнага сакратара КПСС. У хуткім часе Ельцын распускае і забараняе камуністычную партыю. Я ў той час знаходжуся ў Кіеве. Магутны гмах украінскага ЦК зеўрае пусткай. Перад галоўным уваходам стаяць два міліцыянты, якія на кожнае пытаньне адказваюць маўчаньнем і пацісканьнем плячыма. А дзе апора сістэмы, партыйны апарат? Яны ўжо здолелі заняць новыя становішчы ў дзяржаўнай і гаспадарчай адміністрацыі ці сталі на чале сумесных таварыстваў – фарпостаў нованароджанага капіталізму.

Гарбачоў павінен адчуваць сябе ўсё больш самотным. Ён застаецца вельмі папулярным на Захадзе. Захад хацеў бы жыць у міры з крамлёўскімі ўладарамі, але ёсьць адна ўмова: каб гэта былі людзі сімпатычныя, каб усьміхаліся, каб хадзілі добра апранутыя, разьняволеныя, у добрым настроі, дасьціпныя, ветлівыя. І вось праз шэсцьсот гадоў безнадзейнага чаканьня – зьяўляецца такі чалавек: Гарбачоў! Лондан і Парыж, Вашынгтон і Бон – радасна вітаюць, цешацца. Якое ж адкрыцьцё! Якая палёгка!

Паджылыя спадарыні, амерыканскія турысткі ірванулі ў Расію:

– Let’s go to Moscou! Let’s have a lunch with Gorbi!

Расейцы на ўсё гэта глядзяць вялікімі вачыма.

Расейскія аднагодкі амерыканскіх турыстак, якія гадзінамі стаяць у чэргах за кавалкам мяса альбо сыру, думаюць пра генсека з меншым энтузіязмам.

Натуральна, ён павінен усьведамляць гэта. Павінен адчуваць пустку, якая расьце вакол яго. Адной з апораў сістэмы застаецца так званае тэлефоннае права. Вышэйшы становішчам тэлефануе ніжэйшаму і выдае яму загады. Сьмірнова выкінуць з працы, Корсакава – расстраляюць. Ніжэйшы, нічога не распытваючы, павінен выконваць. Калі ён адмовіцца – сам будзе выкінуты ці расстраляны. Дзякуючы такім правілам зносінаў, пасьля падобнага загаду не застаецца ніводнага дакументу, ніводнага доказу рашэньня. Адказнасьць расплылася ў паветры. Тэлефоннае права дзейнічае і ў зваротным кірунку. Ніжэйшы, перш чым прыняць нейкае рашэньне, звоніць да вышэйшага і просіць згоды. Дык вось менавіта па колькасьці тэлефанаваньняў зьнізу ўверх, па іх родзе і значэньні, вышэйшы арыентуецца, наколькі ён яшчэ значны. Многія партыйныя босы ва ўспамінах пішуць, што пра сваю будучую адстаўку яны рабілі выснову з таго, што тэлефоны на іх пісьмовым стале адгукаліся ўсё радзей, пакуль не замоўклі зусім. Гэта азначала канец кар’еры, дэградацыю, адстаўку, а раней – зьнішчэньне.

У канцы 1991 году тэлефоны ў кабінеце Гарбачова звоняць усё радзей.

Цэнтр улады над краінай перасунуўся ў іншае месца: з 12 чэрвеня прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі робіцца Барыс Ельцын, які паступова пераймае стырно ўлады большай часткай тэрыторыі Імперыі.

Гэта менавіта Ельцын у лістападзе абмяжоўвае і прыпыняе кіраваньне камуністычнай партыі (якая на той момант налічвае каля дваццаці мільёнаў членаў). Гэта па яго ініцыятыве, бяз ведама (ці у любым разе – бяз згоды) Гарбачова, на пачатку сьнежня ў Белавежы сустракаюцца кіраўнікі Расійскай Федэрацыі, Беларусі і Украіны і пастанаўляюць стварыць новы саюз – Саюз Незалежных Дзяржаваў. Праз два тыдні да гэтай ініцыятывы далучаюцца кіраўнікі пяці сярэднеазіяцкіх рэспублік. Пачынае выяўляцца форма новай Імперыі.

Гарбачоў застаецца адзін.

Дваццаць пятага сьнежня ён складае абавязкі прэзідэнта СССР. З Крамля здымаюць чырвоны сьцяг з серпам і молатам.

СССР перастае існаваць.

Лёсы перабудовы і працэс заняпаду Імперыі я назіраў па двух экранах:

– на экране тэлевізару (а хутчэй дзясяткаў тэлевізараў, бо ўвесь час мяняў гарады, вакзалы, гатэлі і жытло), і таксама

– на экране акружаючай мяне ў тым падарожжы штодзённай, звычайнай рэчаіснасьці краіны.

Гэта было незвычайнае сутыкненьне двух тэатраў:

– тэатру вялікай палітыкі (тэлевізія гадзінамі трансьлявала паседжаньні Вярхоўнага Савету, розных зьездаў і канферэнцыяў найвышэйшага ўзроўню), а таксама

– тэатру бытавога існаваньня – чэргаў цёмным і халодным ранкам, ночы ў халодных кватэрах у Сібіры, радасьці, што адкрылі сталоўку і можна будзе зьесьці талерку цёплага супу.

Гэтае шызафрэнічнае існаваньне ў двух розных сьветах прымусіла мяне зьвярнуць увагу на прынцыповую і нават бяздонную розьніцу, якая назіраецца ў нашую эпоху паміж часам матэрыяльнай культуры (ці штодзённага жыцьця) і часам палітычных падзеяў. У сярэднявеччы абодва гэтыя часы мелі больш-менш тоесны, адпаведны рытм: гарады будаваліся стагоддзямі і стагоддзямі доўжыліся дынастыі.

Цяпер інакш: гарады надалей будуюцца дзесяцігоддзямі, але ўладары зьмяняюцца кожныя некалькі гадоў ці нават некалькі месяцаў. Палітычная сцэна абарочваецца нашмат хутчэй, чым сцэна нашага штодзённага існаваньня. Зьмяняецца дзяржаўны лад, зьмяняюцца кіроўныя партыі і іх правадыры, а чалавек жыве, як жыў, ён надалей ня мае жытла ці працы, надалей дамы стаяць абадраныя, а на дарогах ямы, надалей ад сьвітанку да ночы працягваецца цяжкае зьвядзеньне канцоў з канцамі.

Можа, таму шмат людзей адварочваецца ад палітыкі: для іх гэта іншы сьвет, які жыве рытмам, адрозным ад таго, у якім праходзіць жыцьцё звычайнага чалавека.

Тэлевізія агулам спрычынілася да падзеньня Імперыі. Праз сам факт, што паказвала правадыроў, як нармальных людзей, што кожны мог убачыць іх зблізку, бачыць, як яны сварацца і нярвуюцца, як памыляюцца і пацеюць, як выйграюць, але таксама, як прайграюць – праз адкрыцьцё заслоны і ўпусканьне народу ў вышэйшыя і найбольш эксклюзіўныя калідоры ўлады зьдзяйсьняецца вызваленчы працэс дэсакралізацыі ўлады.

Бо прызнаваньне сакральнага характару ўлады было адным з канонаў палітычнай культуры расейцаў. Яшчэ да паловы XIX стагоддзя партрэты цара – як сьвятога – віселі ў цэрквах. Бальшавікі ахвотна і пасьпешна пераняли гэтую традыцыю. Жыцьцё правадыроў атачала найвялікшая таямніца. Правадыр нагадваў фараона-мумію. Хадзіў наструнена, не ўсьміхаўся, маўчаў, глядзеў у неакрэсьленую прастору. Штабы саветолагаў вызначалі расстаноўку сілаў у Крамлі, дасьледуючы пасьлядоўнасьць, у якой падаваліся прозьвішчы правадыроў у паведамленьнях. І яны мелі рацыю, бо існавалі падрабязныя і цьвёрдыя інструкцыі наконт таго, у якой пасьлядоўнасьці, колькі разоў, на якой старонцы газеты і якім шрыфтам можна было надрукаваць прозьвішча таго ці іншага кіраўніка. Функцыянеры партыйнага пратаколу сачылі за гэтым з апантанай пільнасьцю. О, глядзіце, Мікаян узьняўся на трыбуну перад Усьцінавым, у гэтым нешта ёсьць! І ўсю Маскву скаланалі плёткі і здагадкі.

Усё большая роля тэлевізіі ў палітыцы прывяла да таго, што ва ўсім сьвеце зьмяніўся кірунак атакі ўсялякіх тэрарыстаў: раней яны штурмавалі палацы прэзідэнтаў, рэзідэнцыі ўраду і парламенту, цяпер намагаюцца найперш авалодаць будынкам тэлевізійнай станцыі. Змаганьні ў Вільні і ў Тбілісі, у Бухарэсьце і ў Ліме вяліся за тэлевізійныя станцыі, а не за палац прэзідэнта. Сцэнар найноўшага фільму пра пераварот: на досьвітку танкі адпраўляюцца, каб здабыць тэлевізійную станцыю, прэзідэнт жа сьпіць спакойна, а ў парламеньце цёмна, жывой душы няма; удзельнікі перавароту едуць туды, дзе ёсьць сапраўдная ўлада.

Кожны працэс вялікіх пераменаў, трансфармацыі дзяржаўнага ладу, сацыяльнай рэвалюцыі, падзяляецца на тры этапы:

– перыяд зьнішчэньня старой сістэмы,

– пераходны перыяд,

– перыяд пабудовы новага парадку.

Былая савецкая імперыя ў дадзены момант знаходзіцца ў пераходным перыядзе, у якім перамешваюцца элементы старой сістэмы і падмуркі новага парадку. Гэты панятак пераходнага перыяду цяпер зьяўляецца адказам на ўсё. Робіцца благое? Цяжка, пераходны перыяд. Кульгае забесьпячэньне? Гэта зразумела, пераходны перыяд. Кіруюць старыя бонзы? Не турбуйся, гэта толькі пераходны перыяд.

Беручы пад увагу вялікі памер гэтай краіны і яе адсталасьць, а таксама той факт, што глыбокія гістарычныя працэсы трываюць доўга, можна дапусьціць, што пераходны перыяд працягнецца шмат гадоў.

Галоўнай задачай, зьместам і ідэяй пераходнага перыяду зьяўляецца вялікія эканамічныя і палітычныя рэформы, замена дзяржаўнага ладу і стварэньне новай якасьці жыцьця.

Два гісторыкі: расейскі – Натан Эйдэльман і амерыканскі – Рычард Пайпс, акрэсьлілі дзьве прынцыповыя рысы ўсіх рэформаў у Расіі на працягу яе гісторыі.

*Эйдэльман:* рэформы ў Расіі заўсёды адбываліся зьверху. Заклік павінен быў сыходзіць з самай вяршыні ўлады, паступова спускаючыся ўніз і там рэалізоўвацца. Тое, што рэформы ў Расіі ішлі зьверху, вырашала іх абмежаваны характар. У пэўны момант рэформа слабела, загразала, спынялася на месцы.

*Пайпс:* рэформы ў Расіі выкліканыя вонкавымі акалічнасьцямі і сіламі.

Такой акалічнасьцю можа быць параза Расіі на міжнароднай арэне, адсоўваньне яе на другі план у гульні за сьвет. Гэтае памяньшэньне ролі Расіі ў сьвеце зьяўляецца аргументам для прыхільнікаў рэформаў, якія пераконваюць сваіх апанентаў і кансерватараў, што варта палепшыць і мадэрнізаваць краіну, каб яна магла вярнуць міжнародную пазіцыю.

Так было дасюль. Як будзе ў будучыні – пакажа час.

Як ужо я згадваў, амерыканскія саветолагі не прадбачылі раптоўнага падзеньня СССР. Але нават тыя людзі, якія верылі і прадказвалі, што гэтая дзяржава калісьці разваліцца, баяліся, што бальшавікі, перш чым аддадуць уладу, спаляць краіну і патопяць яе ў моры крыві.

Нічога такога не адбылося.

Падзеньне камунізму адбылося ў гэтай дзяржаве адносна бяскроўна, а ў карэннай Расіі – цалкам бяскроўна. Вялікая Украіна абвесьціла незалежнасьць без адзінага стрэлу. Гэтаксама і Беларусь.

Па сутнасьці, у сучасным сьвеце назіраецца пашырэньне гэтак званых аксамітных рэвалюцыяў, бяскроўных рэвалюцыяў, ці – як іх акрэсьліў Ісаак Дойчэр – незавершаных.

Іх галоўнай рысай ёсць тое, што старыя сілы адыходзяць не адразу, а змаганьню новага са старым спадарожнічаюць разнародныя адаптацыйныя працэсы, што адбываюцца з абодвух бакоў барыкады. Дамінуе правіла пазьбяганьня драпежных, крывавжэрных канфрантацыяў.

Цікава, што кроў сёньня льецца там, дзе да наступу ідзе сьляпы нацыяналізм або рэлігійны фундаменталізм, ці заалагічны расізм, – вось тры чорныя хмары, якія могуць засланіць неба XXI стагоддзя. Там жа, дзе гаворка ідзе пра зьмену грамадскага ладу і розныя формы класавай барацьбы, што спадарожнічаюць гэтай зьмене, там працэс трансфармацыі працякае значна спакайней і бяскроўна.

Вяртаючыся да Расіі:

Што сёньня, у 1993 годзе, засталося ад старой сістэмы, ад былога СССР? Засталіся:

– старая наменклатура. Яна ва ўладзе і далей. Гэта дзяржаўная, гаспадарчая, вайсковая і міліцэйская бюракратыя. Агулам, як падлічваюць расейскія сацыёлагі – каля 18 мільёнаў чалавек. Для гэтай наменклатуры пакуль няма альтэрнатывы. Апазіцыі, як арганізаванай палітычнай сілы, не існавала. Дысідэнтаў было няшмат і большасьць з іх выехала. Пройдзе нейкі час, пакуль не сфарміруецца іншы, новы палітычны клас. Такі працэс заўсёды працягваецца гадамі;

– засталіся дзьве вялізныя арміі: расейская армія (раней Савецкая) і ўнутраныя войскі. Засталіся памежныя і чыгуначныя войскі. Ваенныя аэрафлот і марфлот. Разам некалькі мільёнаў людзей;

– засталіся магутнае КДБ і міліцыя;

– у руках дзяржавы надалей знаходзіцца ўся сярэдняя і цяжкая прамысловасьць, у тым ліку разьвіты ваенна-прамысловы комплекс, вялікая ваенная прамысловасьць, якая дае працу каля 16 мільёнам чалавек у вытворчасьці і ў дасьледчых інстытутах. Кіраўнікі гэтай прамысловасьці адыгрываюць у палітычным жыцьці важную і актыўную ролю;

– дзяржава працягвае заставацца ўладальнікам зямлі. У сельскай гаспадарцы пануюць калгасы і саўгасы;

– засталася цэлая сфера разумовых навыкаў, грамадскіх адносінаў і зашораных поглядаў, у якіх людзей пераконвалі дзясяткі гадоў;

– засталіся старыя законы.

Апроч гэтых інстытуцыяў ад камунізму засталася яшчэ вялікая і трагічная спадчына – памяць пра ахвяры тэрору і рэпрэсіяў, пра перасьлед, які пачаўся ў 1917 годзе і працягваўся дзясяткі гадоў, у розныя гады набываючы характар масавага вынішчэньня. Гісторыкі і дэмографы, якія займаюцца гэтай праблемай, значна разыходзяцца ў ацэнцы маштабу ўчыненых забойстваў. Мінімальная ацэнка была пададзеная дэмографам Сяргеем Максудавым. Згодна з яго падлікам у 1918-1953 гадах загінулі 54 мільёны грамадзянаў СССР (уключна з ахвярамі I і II сусветных войнаў). Максімальную ацэнку падае прафесар І.Курганаў, які вылічыў, што ў 1918-1958 гадах у лагерах, у турмах і на франтах абодвух сусьветных войнаў разам загінула 110,7 мільёнаў грамадзянаў СССР (“Знамя”, 1/1990).

Яшчэ адной спадчынай, якую пакінула пасьля сябе таталітарная сістэма, зьяўляецца паўсюдная беднасьць гэтага грамадства. Беднасьць жытла, беднасьць вопраткі, беднасьць кухні, беднасьць жыцьця.

Трэці від спадчыны старой сістэмы – гэта трывожнае павелічэньне злачынных сацыяльных груповак – эскалацыя і тэрор узброеных бандаў, рэкет. Апроч таго – усеагульная прысутнасьць самых розных мафіяў, якія сягаюць высокіх зьвеньняў улады; актыўны і нахабны чорны рынак зброі, уключна з ракетамі; нахабны і жахлівы крадзеж; паўсюдная карупцыя; п’янства, гвалт, цынізм, а таксама самае звычайнае, але ўсемагутнае хамства.

Нарэшце, чацьвёрты тып спадчыны – экалагічныя злачынствы: задымленныя гарады, усеагульная адсутнасьць вентыляцыі ў месцах працы, атручаныя рэкі і азёры, сьметнікі. І перадусім, 15 састарэлых і перагружаных атамных электрастанцыяў: 15 патэнцыйных Чарнобыляў, якіх аднак нельга закрыць, бо яны асьвятляюць шмат гарадоў і даюць энергію многім фабрыкам.

Пераходны перыяд, у якім зараз знаходзіцца Імперыя і ў якім застанецца на гады, пачаўся фактычна ў канцы 1991 году. У гэтым перыядзе, які цягнецца цяпер, яшчэ выразьней можа выявіцца адрозьненьне паміж часам матэрыяльнай культуры і часам палітычных падзеяў. Тых, апошніх, будзе напэўна шмат, матэрыяльнага руху наперад будзе значна менш.

Што адбываецца на палітычнай сцэне? Тут ідзе зацятая барацьба паміж рознымі групамі за ўладу. Антыельцынскія групы хочуць зрынуць прэзідэнта Ельцына і яго ўладу. Цяжка выразна акрэсьліць, якая з тых групаў, што стаяць па абодва бакі барыкады, прагрэсіўная, а якая кансерватыўная. Цяжка адказаць, ці наогул ёсьць сэнс прымяняць тут падобныя крытэры. Афіцыйна сьцьвярджаецца, што група Ельцына хоча праводзіць рэформы, а апазіцыйныя групы (якія дзейнічаюць у асноўным у парламенце) – не. Але ці сапраўды гэта так? Патрэба рэформы зьяўляецца аб’ектыўнай неабходнасьцю, гэта прымус часу і сітуацыі, і кожная група, якая будзе ва ўладзе, павінна неяк рэфармаваць і зьмяняць гаспадарку, якая развальваецца, бо інакш краіна загіне, а разам з ёй і тая ўлада.

Безумоўна, застаецца праблема хуткасьці рэформы. Але як гэта вылічыць і акрэсьліць? Знаўцы сьцьвярджаюць, што ў 1992 годзе Расія зрабіла крок наперад, але гэты крок мог быць большы, і нават – значна большы. Словам – нібыта зрабіла крок, але па сутнасьці топчацца на

месцы. У выніку грамадства гэтай краіны змучанае і расчараванае. Можа, гэтае расчараваньне ад таго, што Ельцын і шмат заходніх эксьпертаў-дарадцаў ацэньвалі шанцы рэформаў занадта аптымістычна, забываючыся, што рэформа – гэта зьмена рэчаіснасьці, якая за 70 гадоў крывёй і жалезам была сфармаваная ў гранітную скалу. А раздрабіць такую скалу – колькі ж гэта трэба часу, сілаў і грошай! На мой погляд, адставаньне гэтай краіны, яе нэндза, занядбанасьць і разбуранасьць такія вялікія, што год – гэта занадта кароткі перыяд, каб чакаць заўважнага руху наперад. Пачакайма дзесяць, дваццаць гадоў.

Аднак жа аднаго гэтага году расчараванасьці хапіла, каб сапсаваць палітычную атмасферу краіны.

Усе забылі пра перабудову і галоснасьць. Дэмакратычны лагер, такі актыўны ў барацьбе з камунізмам, быў адсунуты на перыферыю палітычнай сцэны, разьяднаны і знаходзіцца ў забыцьці. Увогуле сёньня ў Расіі ўсё менш гаворыцца пра дэмакратыю.

У грамадстве пануе настрой млявага чаканьня і апатыі, пануе апалітычнасьць.

Верх бяруць сілы, лозунгам якіх стала кансалідацыя ўлады (асабліва цэнтральнай улады) і моцная, вялікая дзяржава. Гэта клімат, які спрыяе ўзмацненьню аўтарытарных метадаў кіраваньня, прыдатны для ўсялякіх формаў дыктатуры.

А будучыня?

Цяжкае пытаньне. Амаль ніводныя прагнозы на тэму сучаснага сьвету не спраўджваюцца. Футуралогія страціла прэстыж і перажывае крызіс. Чалавечае ўяўленьне, якое тысячагоддзямі фармаваў невялікі, просты і статычны сьвет, сёньня не ахоплівае, ня ў стане адолець навакольнай рэчаіснасьці, якая вельмі імкліва разрастаецца (асабліва дзякуючы прагрэсу электронікі і прыросту інфармацыі), у якой зьяўляецца ўсё больш розных складнікаў, у якой мільёны частак, элементаў, адзінак і існасьцяў знаходзяцца ў няспынным руху, у змаганьні, утвараюць новыя канфігурацыі і сістэмы, і гэтага працэса ўжо ні ўхапіць, ні стрымаць, ні апісаць – немагчыма.

Нягледзячы на гэтыя цяжкасьці, можна меркаваць, што на сцэне расейскага жыцьця будуць дамінаваць тры працэсы.

Першы – гэта барацьба паміж сіламі інтэграцыі і дэзінтэграцыі. Нацыяналізм. Расейцы пажадаюць захаваць вялікую і моцную дзяржаву, вялікадзяржаўную і імперскую краіну, у той час як розныя нерасейскія меншасьці будуць усё выразьней імкнуцца да ўласных, аўтаномных мэтаў. Тыя меншасьці цяпер складаюць толькі 20 адсоткаў насельніцтва Расійскай Федэрацыі (80 адсоткаў – гэта расейцы, якіх у Федэрацыі жыве 120 мільёнаў), але нерасейскае насельніцтва прырастае ў пяць разоў хутчэй, чым расейскае, і гэта азначае, што адсоткавы ўдзел расейцаў будзе хутка зьмяншацца. Падобным чынам скарачаюцца межы расейскай мовы. Усё менш людзей на абшары СССР размаўляе па-расейску, і ўсё радзей вывучаюць расейскую мову. У некалькіх месцах падчас свайго падарожжа мне было складана паразумецца па-расейску, асабліва з маладымі людзьмі. Старэйшыя лепш ведаюць расейскую мову, маладыя – менш, а малыя дзеці – ужо амаль зусім ня ведаюць.

(Яшчэ пра расейцаў: за межамі Расійскай Федэрацыі жыве 26 мільёнаў

расейцаў. Іх будучыня няпэўная і няясная. Гэтыя расейцы жывуць у асноўным ва Украіне і ў Казахстане).

Працэс “азіятызацыі” Расійскай Федэрацыі, выкліканы хуткім прыростам нерасейскага насельніцтва, прысьпешваецца таксама эміграцыяй немцаў, і асабліва шматлікай эміграцыяй габрэяў. Апошнія адчуваюць пагрозу нарастаючага антысемітызму, прывіду новых перасьледаў і пагромаў. Гэтая барацьба паміж сіламі інтэграцыі і дэзінтэграцыі можа таксама разыграцца вакол міжрэспубліканскіх межаў. Граніцы на тых абшарах, на якіх існаваў СССР, сёньня – гэта патэнцыйная гадзіньнікавая бомба. У 1921-1980 гадах сучасныя саюзныя рэспублікі зрабілі паміж сабой больш за 90 тэрытарыяльных зьменаў і рэвізіяў граніц. У 1990 годзе паміж тымі рэспублікамі існавала больш за 50 памежных спрэчак, сёньня колькасьць гэтых канфліктаў значна большая. Шматлікія з тых межаў, падобна як у Афрыцы, разразалі землі, населеныя адным і тым жа народам (менавіта так адбылося з мяжою паміж Таджыкістанам і Узьбекістанам).

Іншай вобласьцю канфліктаў можа стацца супрацьстаяньне паміж хрысьціянствам і ісламам. Іслам імкліва адраджаецца, гэта рэлігія народаў, якія гавораць цюркскімі мовамі і налічваюць на тэрыторыі былога СССР каля 60 мільёнаў чалавек.

Другім працэсам, адначасова з барацьбой сілаў інтэграцыі і дэзінтэграцыі, будзе адрознасьць матэрыяльных умоваў жыцьця, якая разьвіваецца ў грамадстве. На адным полюсе будуць зьбірацца багатыя (і ўсё больш багатыя), на другім – бедныя (і ўсё бяднейшыя). Як у кожным грамадстве з нізкім узроўнем жыцьця, у Расіі кантрасты праявяцца асабліва востра, пачнуць з выклікам кідацца ў вочы. Гэта будзе капіталізм, ці псеўдакапіталізм у сваёй найбольш першабытнай, бязьлітаснай, агрэсіўнай форме.

Трэцім працэсам будзе само разьвіцьцё. Гэтае разьвіцьцё я акрэсьліваю нязграбным тэрмінам – анклаўнае разьвіцьцё. Такім чынам, калі мы апынемся ў высокаразьвітай краіне, напрыклад, у Галандыі ці Швейцарыі, зьвернем увагу на тое, што ўся навакольная матэрыяльная рэчаіснасьць – рэчаіснасьць высока разьвітая: дамы добра пафарбаваныя, шыбы паўсюль устаўленыя, асфальт на дарогах роўны, і палосы пазначаныя, крамы паўсюль добра забясьпечаныя, у рэстаранах цёпла і чыста, ліхтары на вуліцах сьвецяць, а трава на траўніках роўна пастрыжаная. У краіне з анклаўным разьвіцьцём пейзаж выглядае інакш. Там шыкоўны банк стаіць пасярод абадраных камяніцаў, элегантны гатэль атачаюць брудныя вуліцы, забудаваныя трушчобамі, з ярка асьветленага лётнішча ўязджаеш у цемру панурага і няўтульнага гораду, каля бліскучай вітрыны крамы Dior – брудныя, пустыя і згаслыя вітрыны мясцовых крамак, каля імпазантных аўтамабіляў – старыя, сьмярдзючыя, напханыя гарадскія аўтобусы. Бо капітал (у асноўным, чужы) пабудаваў свае духмяныя і сьветлыя прытулкі, то бок, ідэальныя анклавы, але рэшту краіны ня можа і ня думае разьвіваць.

Сярод расейцаў працягваецца дыскусія – што рабіць? Адныя кажуць: вярнуцца да каранёў, да старой Расіі. Салжаніцын сьцьвярджае, што царская Расія была цудоўнаю краінаю, “багатай і квітнеючай” (А. Салжаніцын – “Як нам адбудаваць Расію?”), на жаль, прыйшлі бальшавікі і ўсё зьнішчылі. Але ж сьведкі той эпохі даюць менш ідылічны вобраз Расіі:

(...)

Антон Чэхаў у 1890 годзе пісаў:

"…Мы замучылі ў турмах мільёны людзей, замучылі ні за што, бяздумна, па-варварску; мы гналі па марозу закаваных у кайданы людзей дзясяткі тысячы вёрст, заражалі іх сіфілісам, разбэшчвалі, памнажалі злачынцаў і віна за гэта перакладвалася на п'яных турэмных наглядчыкаў. Цяпер уся культурная Еўропа ведае, што не наглядчыкі вінаватыя, толькі ўсе мы, але нас гэта ня тычыцца, нам гэта нецікава" ("Лісты", т.I).

Вярнуцца да старой культуры? Але расейская культура была або арыстакратычная, або вясковая, сялянская – між тым, ужо няма ні арыстакратыі, ні сялянства. Сярэдні клас, мяшчанства заўсёды быў тут нешматлікім і часта – іншаземным.

Праблемы, дылемы, якія стаяць перад гэтым грамадствам, стаяць найперш перад інтэлігенцыяй, перад колам дэмакратаў.

Напрыклад, грамадства і дзяржава. Як далучыць грамадства да сумеснага кіраваньня краінай? Як дэмакратызаваць дзяржаву?

Расійская зямля, яе асаблівасьці і рэсурсы стаяць на баку дзяржавы. Бо глеба карэннай Расіі дрэнная, клімат халодны, дзень большую частку году – кароткі. У тых натуральных умовах зямля дае малы плён, штораз вяртаюцца галодныя гады, селянін бедны, занадта бедны, каб стаць незалежным. Гаспадар ці дзяржава заўсёды мелі над ім вялікую ўладу. Селянін патанаў у даўгах, ня меў што есьці, быў нявольнікам.

Адначасова гэтая зямля багатая сыравінай – нафтай, газам, жалезнай рудой. Але гэта тая сыравіна, эксплуатацыю і зыскі якой лёгка манапалізаваць, у выпадку моцнай бюракратычна-аўтарытарнай дзяржавы – манапалізаваць дзяржавай. Такім чынам, і беднасьць глебы, і яе багацьці выступаюць супраць народу і падтрымліваюць уладу. Гэта адзін з вялікіх парадоксаў Расіі.

Аднак жа будучыня для гэтай краіны вымалёўваецца аптымістычнай. Вялікія грамадствы маюць вялікую ўнутраную сілу. Яны маюць у сабе дастаткова жыцьцёвай энергіі і невычарпальных запасаў сілы, каб узьняцца з самых балючых паразаў і выйсьці з самых цяжкіх крызісаў.

Кітай здолеў падняцца з дна прыніжэньня і голаду і пачаць разьвівацца самастойна і пасьпяхова. Гэтаксама – Індыя. Гэтаксама Бразілія ды Інданэзія. Шматлікасьць гэтых народаў, іх зьяднаная культура, іх здольнасьць трываньня і амбіцыя стварэньня даюць нават у цяжкіх варунках дзіўныя вынікі. Гэты агульны закон разьвіцьця чалавецтва з пэўнасьцю адносіцца і да Расіі.

І яшчэ адно: Захад, які Расія зачароўвае, але і напаўняе страхам, заўсёды гатовы прыйсьці да яе з дапамогай, хоць бы таму, што зацікаўлены ва ўласным спакоі. Захад адмовіць іншым, але Расіі дапаможа заўсёды.

Палямі Расіі, зімой, Мікалай з "Вайны і міру" Льва Талстога вядзе сваю тройку: "Ізноў, стрымаўшы коней, Мікалай азірнуўся: навокал увесь час была тая самая, наскрозь прасякнутая месяцовым сьвятлом, зачараваная раўніна з рассыпанымі па ёй зоркамі.

Захар крычыць, каб я ўзяўся налева; а навошта налева? – падумаў Мікалай. – Ці ж мы едзем да Мелюкоў?

Едзем Бог ведае куды і Бог ведае, што з намі адбываецца!"